



Нацыянальная **бібліятэка: звёны рабочага працэсу**

# Усё адпавядае праектным разлікам...

**Галоўны архітэктар праекта** Нацыянальнай бібліятэкі **Віктар КРАМАРЭНКА:**

— Прэзідэнт Беларусі прыняў рашэнне пра будаўніцтва на базе Нацыянальнай бібліятэкі дадатковых памяшканняў для правядзення міжнародных нарад з удзелам кіраўнікоў дзяржаў. Для гэтага існуе ўся неабходная інфраструктура. Наш эскізны праект круглых залаў разгледжаны 22 жніўня на нарадзе ў прэм'ер-міністра...

Перад галоўным уваходам у бібліятэку прадугледжаны фантан-вадаспад. Ужо ўзведзены помнік славутаму нашаму асветніку Францішку Скарыне. Цяпер вядзецца праца па мастацкім афармленні п'едэстала: на яго плоскасцях размесцяцца рэльефы гарадоў, дзе жыў і ствараў беларускі першадрукар...

Уваходная частка задумана як сімвалічныя гранітныя старонкі вялізнай разгорнутай кнігі. Левае крыло аздоблена цытатамі са Скарынаўскай бібліі, правае — выказваннямі на тэму славянскай пісьменнасці.

Фасад бібліятэчнага будынка, як ужо неаднаразова паведамлялася, складаецца з дзвюх частак. Ніжні стылабат (3—4 паверхі) заняты чытальнымі заламі і памяшканнямі для супрацоўнікаў бібліятэкі. Астатнія паверхі будынка (а ўсяго іх 23) — гэта фондасховішча.

**Галоўны архітэктар праекта Нацыянальнай бібліятэкі Міхаіл ВІНАГРАДАЎ:**

— Бібліятэка размешчана паміж праспектам Незалежнасці і вуліцай Філімонава, на тэрыторыі Сляпянскай водналандшафтнай сістэмы. Побач з будынкам практычна гатовы "Пляц Нацыянальнай бібліятэкі". Магчыма, такая назва і будзе яму нададзена. Мінскпраект зараз актыўна займаецца добраўпарадкаваннем прылеглых земляў. Парк скульптуры, зялёная зона з кавярнямі, атракцыёнамі стануць часткай Нацыянальнага бібліятэчнага парку (дзесьці 30 гектараў). Галоўным уваходам у яго з'явіцца будынак бібліятэкі...

Апошняе, што хачу дадаць: бібліятэчнае абсталяванне — самае сучаснае. Напрыклад, так званыя інтэрліфты (швейцарскі варыянт, бо на абсягах СНД яны яшчэ не выкарыстоўваюцца!) дапамогуць чытачам вельмі хутка атрымаць патрэбную кнігу. Замова яе ажыццяўляецца па камп'ютэры. Кніга ўпакоўваецца ў кантэйнер з аўтаномным электрарухавіком. Кантэйнер перасоўваецца ў любым накірунку па мона-рэйцы, пакуль знойдзе з дапамогай камп'ютэра адрасата.

**Галоўны канструктар Нацыянальнай бібліятэкі Цімафей ПЯЦОЛЬД:**

— Доўга шукалі аптымальнае рашэнне канструкцыі. Аптымальнага па трываласці, жорсткасці, па мінімуме расходваемага будматэрыялу. З 18 прапанаваных варыянтаў нас задаволіў па названых паказчыках толькі апошні. Болын чым за год будынак асеў раўнамерна па перыметры ўсяго на 56 міліметраў. Апошнімі месяцамі асадка стабілізавалася. Кантроль за дэфармацыяй падмурка — самы ўважлівы. Усё адпавядае праектным разлікам...

Выкананая інжынерная праца не мае аналагаў у свеце па арыгінальнасці, адмысловасці і неймавернай складанасці. Агульная вага будынка Нацыянальнай бібліятэкі (разам з кніжным фондам) — 140 тысяч тон.

**Падрыхтаваў Я.Р.**
**Фота**
**Андрэя СПРЫНЧАНА**
**і Юрыя ІВАНОВА**





## На п'едэстале — выявы гарадоў

***Як паведамляе Алесь Дранец — аўтар помніка Францішку Скарыне (што паўстаў побач з уваходам у Нацыянальную бібліятэку), кожная з трох граней п'едэстала будзе праз пэўны час аздоблена мастацкімі рэльефамі. На цэнтральнай плоскасці размесціцца надпіс "Францішак Скарына", на астатніх — выявы гарадоў, з якімі цесна звязаны жыццё і творчасць слыннага беларускага асветніка.***

Натуральна, гэта Полацк, дзе Скарына нарадзіўся і ўсвядоміў сябе беларусам. Цэнтр нацыянальнай культуры і асветніцтва. Наступны горад — Падуя. Менавіта тут, у мясцовым універсітэце, малады вучоны бліскуча абараніў ступень доктара лекарскіх навук, уразіўшы Італію розумам і дасведчанасцю. На трэцяй грані п'едэстала можна будзе пабачыць характэрныя сілуэты Прагі, дзе першадрукар выдаў з 1517 да 1519 года 23 кнігі Бібліі на роднай беларускай мове.

**Яўген МІКАЛАЕЎ**



**Тут 30 жніўня 2005 года Ф. Скарына "прапісаўся" навечна...**